# Дарыць дзецям радасць адкрыццяў

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Вілейскай гімназіі № 2 Віктар Віктаравіч Кажура яскрава праяўляе сябе ў рознабаковай дзейнасці ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Прапануем вам, шаноўныя чытачы, пазнаёміцца з гэтай цікавай, адоранай, творчай асобай, захопленай настаўніцкай працай. Безумоўна, такія людзі, як Віктар Віктаравіч, у ліку тых, хто робіць значны ўнёсак у развіццё і дасягненні Мінскай вобласці.

Каб адразу даць абагульненае ўяўленне пра героя публікацыі, пералічым факты біяграфіі, якія яго выразна характарызуюць. Віктар Віктаравіч Кажура — настаўнік-метадыст, магістр адукацыі, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, сябра рады Мінскага абласнога аддзялення СПБ, сябра рэдакцыйнай рады часопіса «Роднае слова». Ён узнагароджаны граматамі Мінскага абласнога аддзялення СПБ, ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», з'яўляецца лаўрэатам Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры ў намінацыі «Дзіцячая і падлеткавая літаратура», лаўрэатам прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асаблівы ўклад у развіццё здольнасцей адораных вучняў і студэнтаў, пераможцам конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года Вілейскага раёна — 2017». Тройчы (у 2008, 2014 і 2021 гг.) прызнаваўся пераможцам індывідуальнага спаборніцтва сярод працаўнікоў народнай гаспадаркі раёна за званне «Лепшы па прафесіі» ў намінацыі «Лепшы працаўнік установы адукацыі» (з занясеннем на раённую Дошку гонару). Працоўныя дасягненні адзначаны шматлікімі граматамі і дыпломамі Вілейскага раённага ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме, галоўнага ўпраўлення адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, Граматай і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

***— Віктар Віктаравіч, раскажыце, калі ласка, якім быў Ваш шлях у педагагічную прафесію?***

— Пасля заканчэння ў 1976 г. Карпавіцкай сярэдняй школы ў мяне не было ваганняў, куды пайсці вучыцца. Яшчэ перад выпускным вырашыў, што буду падаваць дакументы на філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. Прычыны? Асабістая зацікаўленасць і прыхільнасць да роднай мовы, а яшчэ — уплыў настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Рэгіны Уладзіміраўны Чаеўскай.

Калі стаў дыпламаваным спецыялістам, атрымаў накіраванне ў Шыпкоўскую васьмігадовую школу Вілейскага раёна, у ёй адпрацаваў адзін год. Потым два гады займаў пасаду дырэктара Забарскай васьмігадовай школы, а ў 1986-м атрымаў новае



Віктар Віктаравіч Кажура

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»